щее время [4], однако до создания полноценной истории ПСР в эмигрантский период ее существования пока говорить рано.

Особого внимание заслуживает проблема взаимодействия эсеровской эмиграции и международного социалистического движения. Второй Интернационал распался после окончания Первой мировой войны. В марте 1919 г. по инициативе большевиков в Москве создается Коминтерн, претендующий на лидерство в европейском социалистическом движении. Эсеры в эмиграции, наряду с другими социалистическими группами, работали над восстановлением Второго Интернационала (этот процесс завершился в мае 1923 г. созданием объединенного Социалистического Рабочего Интернационала), информировали западных социалистов о положении дел в Советской России. Когда в 1922 г. было объявлено о судебном процессе над лидерами ПСР в Москве, международное социалистическое движение приняло активное участие в протестной кампании и провело уникальную совместную конференцию всех Интернационалов в Берлине в апреле 1922 г. Таким образом, публикация и всесторонний анализ материалов эсеровской эмиграции по целому ряду направлений являются весьма перспективными.

Эсеровская эмиграция оставила большое идейно-теоретическое наследие, в том числе мемуарные и исторические работы (многие из которых не опубликованы), непредвзятое изучение которых представляет немалый научный интерес. Социалистические партии в послеоктябрьской России были в числе тех, кто дал старт попыткам разоблачить антидемократический характер большевизма. Неудача социалистов-революционеров и меньшевиков в этой борьбе, тем не менее, не тождественна их поражению в историческом споре о демократии, социализме и роли политических партий. Современная историческая наука стоит перед глобальной задачей написания истории социализма и социалистических идей в России, начиная с эпохи XIX в. до современности. Исследования по истории социалистических партий являются важной частью этого процесса.

1. Аврус, А. И. От Хвалынска до Нью-Йорка: жизнь и общественно-политическая деятельность В. М. Чернова / А. И. Аврус, А. П. Новиков. – Саратов : Изд-во Сарат. ун-та, 2013. – 300 с.

2. Государственный архив Российской Федерации. – Ф.6065. – Оп.1. – Д.63.

3. Коновалова, О. В. В.М.Чернов о путях развития России / О. В. Коновалова. – М. : РОССПЭН, 2009. – 383 с.

4. Конференция Пражской группы партии социалистов-революционеров 1931 г. / публикацию подготовили А. П. Новиков и А. Ю. Суслов // Вопросы истории. – 2014. – № 8. – С. 3–26; № 9. – С. 3–15; № 10. – С. 3–14; № 11. – С. 3–18; № 12. – С. 3–19; 2015. – № 1. – С. 3–15; № 2. – С. 3–12.

5. «Мы, русские, – другие, мы созданы для испытаний». Письма В. М. Чернова. 1920-1941 / публ., вступ. ст., подгот. текста и коммент. Г. В. Лобачевой, А. П. Новикова ; [науч. ред. проф. И. Р. Плеве]. – Саратов : Сарат. гос. техн. ун-т, 2014. – 412 с.

6. Партия социалистов-революционеров после октябрьского переворота 1917 года: Документы из архива П.С.-Р. / собрал и снабдил примечаниями и очерком истории партии в пореволюционный период Marc Jansen. – Amsterdam : Stichting beheer IISG, 1989. – 772 с.

7. Партия социалистов-революционеров. Документы и материалы. В 3 т. Т. 3. Ч. 2. Октябрь 1917 г. – 1925 г. – М. : РОССПЭН, 2000. – 1055 с.

8. Судебный процесс над социалистами-революционерами (июнь–август 1922 г.): Подготовка. Проведение. Итоги. Сборник документов / сост.: С. А. Красильников, К. Н. Морозов, И. В. Чубыкин. – М. : РОССПЭН, 2002. – 1007 с.

9. Суслов, А. Ю. Отечественная историография российских социалистических партий: теоретико-методологические аспекты / А. Ю. Суслов // Вестник Сургутского государственного педагогического университета. – 2013. – № 6 (27). – С. 187–193.

10. White, E. The Socialist Alternative to Bolshevik Russia: The Socialist Revolutionary Party, 1921 – 1939. – Milton Park, Abingdon, Oxon; New York: Routledge, 2010. – 208 p.

**Разуванава К.С.**

## МАТЭРЫЯЛЫ ПА ГІСТОРЫІ ДЗЕЙНАСЦІ БЕЛАРУСКАГА ІНСТЫТУТА ГАСПАДАРКІ І КУЛЬТУРЫ Ў АРХІЎНЫХ ФОНДАХ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Гісторыя ўзнікнення і дзейнасці Беларускага інстытута гаспадаркі і культуры (БІГіК) – адной з найбольш значных культурна-асветных і гаспадарчых арганізацый міжваеннага часу – і сёння выклікае інтарэс даследчыкаў як у нашай краіне, так і па-за яе межамі. Дадзеная цікаўнасць выклікана значным масівам крыніц і дакументальных матэрыялаў, якія пакінула арганізацыя, а таксама даволі добрым адлюстраваннем яе дзейнасці ў тагачасных перыядычных выданнях.

На жаль, да сённяшняга дня не была зроблена спроба выдання ў якасці асобнага зборніка адзначаных матэрыялаў, таму бадай што адзінымі крыніцамі, што маюць друкаваны выгляд, з’яўляюцца кнігі-брашуры “Статут Таварыства “Беларускі Інстытут Гаспадаркі і Культуры” ў рэдакцыях 1926 і 1929 гадоў, а таксама “Інструкцыя Беларускага Інстытуту Гаспадаркі і Культуры”, якія выйшлі ў свет дзякуючы намаганням творцаў інстытута як праграмныя дакументы



Репозиторий ВГУ

ўстановы, прызначаныя для тлумачэння мэтаў і задач інстытута, асаблівасцяў арганізацыі і функцыянавання яго нізавых суполак [22; 23; 24].

Найбольшая колькасць крыніц, што маюць непасрэднае дачыненне да асвятлення гісторыі інстытута, сярод айчынных архіўных сховішчаў змяшчаецца, безумоўна, у Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь (НАРБ). Сярод яго фондаў найбольш значным з'яўляецца фонд 880 (Беларускі інстытут гаспадаркі і культуры), аснову якога складаюць арыгінальныя матэрыялы або копіі дакументаў Літоўскага цэнтральнага дзяржаўнага архіва. Названы фонд, змяшчае 22 справы і паслядоўна раскрывае асаблівасці дзейнасці Цэнтральнага ўрада інстытута, яго стуктурных адзінак, аддзелаў і нізавых суполак БІГіК (у тым ліку найбольш буйных гурткоў у Жодзішках Вілейскага павета і Южках Віленска-Троцкага павета), падначаленых установе арганізацый (кшталту Беларускага Народнага Тэатра); ілюструе супрацоўніцтва БІГіК на ніве развіцця адукацыі і асветы з арганізацыямі адпаведнага накірунку, як на тэрыторыі Заходняй Беларусі (напрыклад, з Таварыствам беларусазнаўства Віленскага ўніверсітэта), так і па-за яе межамі (сярод найбольш значных карэспандэнтаў інстытута можна назваць Камісію па вывучэнню Заходняй Беларусі Беларускай акадэміі навук), а таксама з грамадскімі і палітычнымі арганізацыямі краю (у якасці прыклада можна прывесці актыўны ўдзел членаў БІГіК ў працы Беларускага нацыянальнага камітэта ў Вільні). Не меншую цікавасць уяўляюць сабой матэрыялы афіцыйнай перапіскі інстытута з прадстаўнікамі цэнтральнай і мясцовай улады Польшчы па пытаннях адкрыцця беларускіх школ, настаўніцкай семінарыі, а таксама арганізацыі і працы Беларускіх кааператыўна-гандлёвых курсаў [18].

Не менш каштоўны матэрыял прадстаўлены і ў іншых фондах НАРБ. Сярод іх трэба асобна вылучыць 879 (Беларускі нацыянальны камітэт (беларускі буржуазна-нацыяналістычны цэнтр) г. Вільня), 883 (Галоўнае ўпраўленне Таварыства беларускай школы, г. Вільня), 884 (Праўленне Беларускага студэнцкага (буржуазна-нацыяналістычнага) саюза пры ўніверсітэце імя Стэфана Баторыя, г. Вільня), 242 п (Прадстаўніцтва ЦК КПЗБ). Дакументы адзначаных фондаў паслядоўна раскрываюць эвалюцыю ўзаемаадносін устаноў-фондастваральнікаў з БІГіК на ніве развіцця культуры, асветы і гаспадарчай дзейнасці ў Заходняй Беларусі, а таксама дазваляюць уявіць асаблівасці гістарычнага фону стварэння і дзейнасці арганізацый-фондаўтваральнікаў [17; 19; 20; 21].

Не менш значныя матэрыялы змяшчаюцца ў фондах абласных архіваў. Першынства па колькасці крыніц, якія прама ці ўскосна адлюстроўваюць дзейнасць БІГіК, займае Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці (ДАБр). Асноўная колькасць з адзначаных матэрыялаў захоўваецца ў фондах 1 (Полесское воеводское управление, г. Брест Полесского воеводства) і 59 (Попечительство Брестского школьного округа Министерства вероисповеданий и общественного просвещения Польши, г. Брест Полесского воеводства) [9; 10; 11; 12]. Меншыя па колькасці, аднак ніякім чынам не меншыя па значнасці дакументы аб дзейнасці інстытута захоўваюцца таксама ў фондах Дзяржаўнага архіва Гродненская вобласці (ДАГр). Сярод іх можна вылучыць фонды 200 (Лидская поветовая коменда государственной полиции (Коменды государственной полиции прифронтовых и этаповых территорий) (с 1921 – 15-го Новогрудского округа), г. Лида Лидского повета Новогрудского воеводства), 541 (Несвижское поветовое староство Новогрудского воеводства г. Несвиж), 551 (Новогрудское воеводское управление Министерства Внутренних дел, г. Новогрудок Новогрудского воеводства), 662 (Новогрудская воеводская коменда государственной полиции Новогрудского воеводства г. Новогрудок) [13; 14; 15; 16]. Нарэшце, асобныя матэрыялы па дзейнасці суполак БІГіК на тэрыторыі Віленскага ваяводства змешчаны ў фондах 9 (Молодечненская поветовая комендатура государственной полиции Виленского воеводства, г. Молодечно) і 14 (Воложинская поветовая комендатура государственной полиции Новогрудского воеводства, г. Воложин) Занальнага дзяржаўнага архіва ў г. Маладзечна (ЗДАМал) [7; 8].

Пэўная колькасць дакументальных матэрыялаў, звязаных з гісторыяй дзейнасці інстытута, змяшчаецца ў фондзе 3 (Калекцыя дакументаў аддзела рукапісаў Беларускага музея імя Івана Луцкевіча ў г. Вільні, воп. 3) Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва (БДАМЛіМ). Найбольшую цікавасць сярод іх уяўляюць сабой афіцыйныя дакументы і перапіска інстытута з Беларускім навуковым таварыствам у Вільні, Таварыствам беларускай школы, Таварыствам беларусазнаўства пры Віленскім універсітэце, іншымі беларускімі культурна-асветнымі ўстановамі Вільні і замежжа, а таксама матэрыялы, падрыхтаваныя да друку



Рэпазіторый БрДУ

на старонках такіх газет, як "Беларуская крыніца", "Беларускі звон", "Наперад", "Хрысьціянская думка" і іншых [6].

Не менш значныя матэрыялы, прысвечаныя пэўным пытанням дзейнасці Беларускага інстытута гаспадарскі і культуры, знаходзяцца ў асабістых фондах Аддзела рэдкіх кніг і рукапісаў Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Я. Коласа. Так, важныя звесткі аб найбольш вядомых дзеячах БІГіК, асаблівасцях яго стварэння і дзейнасці змяшчаюцца ў асабістых фондах членаў інстытута – І.І. Шутовіча (Ф. 1), А.В. Станкевіча (Ф. 4), А.Ю. Клімовіча (Ф. 5), М.І. Пецюкевіча (Ф. 60), а таксама ў фондзе Ф. 23 (Калекцыя матэрыялаў па гісторыі, навуцы, культуры), які ўяўляе сабой збор дакументальных матэрыялаў па самых розных пытаннях культурнага і навукова-асветнага жыцця Беларусі [1; 2; 3; 4; 5].

Важнай крыніцай, якая адлюстроўвае гісторыю дзейнасці інстытута, а таксама сацыяльна-эканамічныя, нацыянальна-рэлігійныя і культурна-адукацыйныя абставіны яго ўзнікнення і ліквідацыі, з'яўляюцца беларускія перыядычныя выданні міжваеннага перыяду, што друкаваліся на тэрыторыі Заходняй Беларусі і этнічных польскіх зямель. Сярод такіх выданняў (большасць з іх змяшчаецца ў фондах Нацыянальнай бібліятэкі Рэспублікі Беларусь і Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Я. Коласа) можна назваць газеты і часопісы, што выйшлі ў свет дзякуючы намаганням БІГіК і асобных яго дзеячаў ("Самапомач", "Калосьсе", "Шлях моладзі", "Wiadomości białoruskie"), Беларускай хрысціянскай дэмакратыі ("Беларуская крыніца", "Хрысьціянская думка"), Беларускага сялянскага саюза ("Сялянская ніва"), Беларускай сялянска-работніцкай грамады ("Народная справа", "Народны звон", "Наша справа", "Наша праўда", "Голас працы"), Таварыства беларускай школы ("Беларускі летапіс", "Родныя гоні"), Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі ("Наша воля", "Бюллетень КПЗБ"), пасольскага клуба "Змаганне" ("Змаганьне", "На варце", "Беларуская газета"), Цэнтрасаюза і групы А. Луцкевіча ("Новая варта", "Беларускі звон", "Наперад"), а таксама такія значныя выданні, як "Беларускі каляндар", "Студэнцкая думка", "Przegląd Wileński", "Nowy Przegląd", "Natio", "Kurjer Wileński" і многія іншыя.

Такім чынам, архіўныя фонды айчынных устаноў утрымліваюць значны масіў дакументальных матэрыялаў, звязаных з абставінамі стварэння і дзейнасці БІГіК, асаблівасцямі яго сувязяў з палітычнымі партыямі, грамадскімі арганізацыямі і ўстановамі як на тэрыторыі Заходняй Беларусі, так і па-за яе межамі, што дазваляе даследчыкам даволі поўна вызначыць ролю і месца дадзенай арганізацыі ў грамадска-палітычным і культурным жыцці беларускіх зямель, якія ў міжваенны час уваходзілі ў склад Польшчы.

1. Аддзел рэдкіх кніг і рукапісаў Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Я. Коласа НАН Беларусі. – Ф. 1. Воп. 1. Спр. 24, 383.
2. Аддзел рэдкіх кніг і рукапісаў Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Я. Коласа НАН Беларусі. – Ф. 4. Воп. 1. Спр. 45, 58, 67, 93, 127, 143.
3. Аддзел рэдкіх кніг і рукапісаў Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Я. Коласа НАН Беларусі. – Ф. 5. Воп. 1. Спр. 1, 7, 18, 70, 71.
4. Аддзел рэдкіх кніг і рукапісаў Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Я. Коласа НАН Беларусі. – Ф. 23. Воп. 1. Спр. 453, 629.
5. Аддзел рэдкіх кніг і рукапісаў Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Я. Коласа НАН Беларусі. – Ф. 60. Воп. 1. Спр. 73.
6. БДАМЛіМ. – Ф. 3. Воп. 1. Спр. 24, 25, 33, 43, 44, 111, 188, 201, 280.
7. ЗДАМол. – Ф. 9. Воп. 1. Спр. 233, 237.
8. ЗДАМол. – Ф. 14. Воп. 1. Спр. 26.
9. ДАБр. – Ф. 1. Воп. 9. Спр. 47, 64, 320, 743, 760, 988, 1260, 1374.
10. ДАБр. – Ф. 59. Воп. 1. Спр. 314.
11. ДАБр. – Ф. 59. Воп. 2. Спр. 1131.
12. ДАБр. – Ф. 59. Воп. 3. Спр. 983.
13. ДАГр. – Ф. 200. Воп. 2. Спр. 10, 12.
14. ДАГр. – Ф. 541. Воп. 1. Спр. 156, 178.
15. ДАГр. – Ф. 551. Воп. 1. Спр. 199, 1070, 1137, 1211.
16. ДАГр. – Ф. 662. Воп. 3. Спр. 11.
17. НАРБ. – Ф. 242-П. Воп. 1. Спр. 24, 59, 305, 463, 483.
18. НАРБ. – Ф. 880. Воп. 1. Спр. 1–22.
19. НАРБ. – Ф. 879. Воп. 1. Спр. 32, 47.
20. НАРБ. – Ф. 883. Воп. 1. Спр. 34, 112, 115.
21. НАРБ. – Ф. 884. Воп. 1. Спр. 3, 57.
22. Статут таварыства "Беларускі інстытут гаспадаркі і культуры" / Беларуская друкарня імя Ф. Скарыны. – Вільня, 1926. – 16 с.
23. Статут таварыства "Бедарускі інстытут гаспадаркі і культуры" / Беларуская друкарня імя Ф. Скарыны. – Вільня, 1929. – 16 с.
24. Instrukcyi i rehulamin Biełaruskaha Instytutu Haspadarki i Kultury / Biełaruskaja Drukarnja im. Fr. Skaryny. – Wilnia, 1931. – 46 s.

Репозиторий БГУ